# НЕВЯДОМЫЯ СТАРОНКІ БІЯГРАФІІ КАРАЛЯ ПОЛЬСКАГА І ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ЛІТОЎСКАГА ЯГАЙЛЫ

*Хаменка Д.М.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Мікалаева Л.В. – канд. гіст. навук, дацэнт*

Даклад прысвечаны аналізу становішча маці Ягайлы Ульяны Цвярской і яе ўплыву на палітыку сына, а таксама разгляду праблематыкі праваслаўных імёнаў, якія фігуравалі ў крыніцах XIV–XV стст. у дачыненні да прадстаўнікоў дынастыі Гедымінавічаў, асабліва Альгерда і яго сыноў.

Пункт гледжання паводле якога маці Ягайлы лічылася галоўным кіраўніком знешняй палітыкі Вільні на працягу многіх гадоў дамінаваў у навуковых манаграфіях. Так, С. Смолька прадстаўляючы першыя самастойныя крокі Ягайлы ў Вялікім Княстве Літоўскім (далей – ВКЛ), сцвярджаў, што «ўсё цягнула яго ў абдымкі Русі: атмасфера, якой ён дыхаў, уплыў маці, палітычная неабходнасць», але Кейстут стрымліваў гэта. Аднак навукоўца лічыў, што спроба Ягайлы прыняць праваслаўе была самастойным рашэннем, але яму перашкодзіў пасланнік польскіх паноў з прапановай шлюбу.

А. Прахаска сцвярджаў, што Ягайла заставаўся пад уплывам маці і сябраваў з рыжскім арцыбіскупам, што аддаляла яго ад Кейстута. На яго думку, Ульяна накіроўвала сына да мірных адносін з ордэнам і хрышчэння. А. Прахаска ігнараваў самастойныя памкненні Ягайлы, які працягваў палітыку Альгерда і шукаў пагаднення з Ордэнам дзеля экспансіі на ўсход. Ён таксама адзначаў, што Ульяна спрыяла кантактам з ордэнам. Паводле меркавання вучонага, яна імкнулася кіраваць Ягайлам і пасварыць яго з Кейстутам, што прывяло да грамадзянскай вайны ў ВКЛ.

Самае крайняе жа меркаванне выказаў С. Закшэўскі, кажучы, што «варта задумацца, ці не Лізавета і вялікая княгіня літоўская былі сапраўднымі ініцыяткамі шлюбу іх дзяцей». Ён лічыў, што анжуйская і літоўская дынастычная ініцыятыва спрыяла польска-літоўскай уніі, а форма злучэння Польшчы і ВКЛ была другаснай. Аднак гэта гіпотэза не была пацверджана дакументальна.

Ягайла пераняў княжанне ў 1377 г. Пытанне яго ўзросту на той момант (15 ці 25 гадоў) другараднае. Безумоўна, што ў любым выпадку аўтарытэт маці і яе парады маладому князю былі вельмі патрэбныя, калі яго становішча ў грамадстве, асабліва ў рускіх падданых, не было ўсталявана. Але трэба дадаць, што Ягайла мусіў улічваць прэтэнзіі сваіх зводных братоў, а таксама ён карыстаўся парадамі і аўтарытэтам свайго дзядзькі Кейстута. Што датычна ўзросту князя, то мяркуем, што больш слушнай з'яўляецца меркаванне, якое лічыць, што Ягайла нарадзіўся ў 1352 г.

Найлепш абагульніў дзейнасць ордэна Е. Ахманьскі, адзначыўшы, што крыжакі папярэдзілі Ульяну аб пагрозе Ягайлу з боку Кейстута, які, нібыта, меў намер падпарадкаваць ВКЛ. Гэта сведчыла, што Ульяна магла быць рупарам тэўтонскай прапаганды, але пацвердзіць гэта складана, бо дакументы тэўтонскай канцылярыі аднабокія, а дакументаў канцылярыі ВКЛ няма.

31 кастрычніка 1382 г. Ягайла заключыў на Дубісе дагавор з Тэўтонскім ордэнам супраць Кейстута. У ім згадвалася, што пагадненне заключана «з парады і са згоды» маці Ульяны, а таксама братоў і княжацкай рады. Гэта сведчыла пра існаванне дарадчага органа пры князі. Л. Корчак мяркуе, што прысутнасць Ульяны ў тэўтонскіх крыніцах носіць ідэалагічны характар: рыцары маглі выкарыстоўваць яе аўтарытэт як сродак ціску на Ягайлу.

Да яшчэ адной з неразгаданых таямніц ранняй гісторыі ВКЛ і ў прыватнасці перыяду кіравання Ягайлы належаць праваслаўныя, рускія імёны яго самога, яго бацькі і братоў, паданыя рускімі летапісцамі і публіцыстамі, якія пісалі ў XIV–XV стст.

У цвярскім апавяданні пра вялікую княгіню Ульяну і звязанай з ёй генеалогіі літоўскіх князёў яе старэйшы сын фігуруе як Якаў, а не як Ягайла, і павінен быў вызнаваць праваслаўнае хрысціянства, ад якога ён адмовіўся, прыняўшы «римскую веру».

Паводле тых жа цвярскіх крыніц, перададзеных у «Послании» Спірыдона-Савы, Альгерда ахрысцілі на смяротным ложы з імем Аляксандр, пасля чаго ён прыняў манаства пад імем Алексій. А пахавалі яго ў заснаванай княгіняй Ульянай царкве Маці Божай у Вільні.

Аднак Густынскі летапіс і Хроніка Быхаўца сцвярджаюць, што Альгерд ахрысціўся яшчэ ў 1340 г. пры шлюбе з віцебскай князёўнай, але памылкова называюць яе Ульянай замест Ганны.

Трэці Пскоўскі летапіс (1341–1342 гг.) апісвае, як пскавічы прапанавалі Альгерду княжанне пры ўмове хрышчэння, але ён адмовіўся, хоць згадзіўся ахрысціць сына Андрэя. Князь мог мець «малітоўнае імя» і наведваць праваслаўныя храмы як катэхумен.

Візантыйскія кананісты (Іаан Занара, Феадор Вальсамон, Аляксій Арыстэнас) вызначалі катэхуменаў як тых, хто рыхтуецца да хрышчэння. Яны падзяляліся на слухачоў (*audientes*), якія пакідалі службу пасля чытання Евангелля, і вернікаў (*pistoi*), што заставаліся на малітву і называліся таксама ўкленчанымі.

З 1340 г. Альгерд, верагодна, быў катэхуменам-слухачом, бо пскавічы разглядалі магчымасць яго хрышчэння. Аўтар Густынскага летапісу (XVII ст.) жа мог сказіць больш раннюю крыніцу, якая, магчыма, згадвала толькі абяцанне хрысціцца.

Такім чынам дакладны момант пераходу Альгерда ў вышэйшую катэгорыю катэхуменаў-вернікаў і прыняцця імя Аляксандр застаецца нявызначаным. Таксама немагчыма і цалкам адкінуць цвярское сведчанне пра яго хрышчэнне перад смерцю. Але ўсё ж афіцыйна Альгерд заставаўся язычнікам і быў спалены паводле літоўскага звычаю.

Ягайла заставаўся язычнікам да свайго каталіцкага хрышчэння ў 1386 г., але яшчэ раней, падчас выгнання на Русь (1381–1382 гг.) у выніку прыходу да ўлады Кейстута, ён прыняў у праваслаўнай царкве малітоўнае імя Якаў і статус катэхумена-верніка. Гэта адбылося ў Віцебску, дзе Ягайла кіраваў да сярэдзіны 1382 г.

Дакладны час хрышчэння брата Ягайлы Скіргайлы невядомы, але мяркуецца, што гэта адбылося ўвосень 1381 г. падчас яго аблогі Полацка або крыху пазней, на рубяжы 1381–1382 гг., у выніку пагаднення з Кейстутам. Карыбут яшчэ як язычнік у 1380 г. асадзіў тэўтонскі замак Баерн, але ўжо ў 1382 г. быў на Северршчыне, дзе прыняў імя Дзімітр і ахрысціўся. Лінгвен, верагодна, таксама быў ахрышчаны па волі Кейстута пад імем Сямён і згадваецца як Сямён Лінгвен у 1386 г на старонках Наўгародскага IV Летопісу.

Безумоўна, невыпадкова, што толькі чацвёра старэйшых сыноў Ульяны мелі рускія імёны: Ягайла, Скіргайла, Карыбут і Лінгвен. Тры малодшыя сыны: Карыгайла, Вігунт-Мінігайла і Свідрыгайла былі менш небяспечныя для Кейстута і змаглі застацца язычнікамі ў Літве, а потым прыняць каталіцкае хрышчэнне і польскія імёны ў 1386 г.

Вываз старэйшых сыноў Альгерда і Ульяны на Русь і іх далучэнне да праваслаўя аказалі негатыўны ўплыў на Кейстута, бо далі магчымасць Ягайлу наладзіць саюз з вялікім маскоўскім князем Дзмітрыем Данскім. Архіўныя дакументы сведчаць пра заключэнне пагаднення паміж Ягайлам, яго братамі і Масквой, у тым ліку пра шлюбную дамову з умовай прыняцця Ягайлам праваслаўя.

Спроба Ягайлы заключыць саюз з Масквой сустрэла рэзкае супраціўленне вялікага князя Кейстута. Ён спыніў без заключэння дагавора вайну супраць ордэна і ажыццявіў паход на Севершчыну супраць Карыбута, каб прадухіліць аддзяленне Рускіх зямель ад Літвы. Падчас гэтага паходу Кейстут летам 1382 г. заключыў з Масквой мірнае пагадненне, у тым ліку аб вызначэнні межаў абедзвюх дзяржаў. Такім чынам, праект Ягайлы аб заключэнні саюза з Дзмітрыем Данскім супраць Кейстута праваліўся. Вялікія перамены, якія адбыліся ў Маскве і ВКЛ ў 1382 г., пазбавілі яе для Ягайлы ўсякага значэння і прывабнасці. Хан Тахтамыш 26 жніўня 1382 г. захапіў Маскву і спустошыў амаль усю Маскоўскую дзяржаву. Мітрапаліт Кіпрыян пакінуў Маскву і пасяліўся ў Кіеве. У ВКЛ Кейстут памёр у вязніцы ў Крэўскім замку, і язычніцкія падданыя Ягайлы, асабліва жамойты, патрабавалі ад яго заставацца язычнікам. Тады Ягайла канчаткова адмовіўся ад плана заключыць саюз з Дзмітрыем Данскім, замацаваны праваслаўным хрышчэннем і шлюбам з яго дачкой. Таму ён перастаў ужываць праваслаўнае імя Якаў, памяць аб якім захавала толькі цвярская аповесць пра вялікую княгіню Ульяну і розныя залежныя ад гэтага тэксту рэдакцыі радаводу літоўскіх князёў, таксама напісаныя ў Цвяры.

Такім чынам, у заключэнні аналізу лічым, што да пытання ўплыву маці на Ягайлу трэба падысці асцярожна і вельмі крытычна, бо гэта не пацвярджаецца паведамленнямі крыніц. Цвярскія крыніцы захавалі памяць пра праваслаўнае імя Ягайлы – Якаў. Гэта было яго «малітоўнае імя», якое ён насіў як катэхумен вышэйшага ўзроўню падчас падрыхтоўкі да хрышчэння.

***Список использованных источников:***

*1. Osiński, K. Pozycja Julianny Twerskiej w Wielkim Księstwie Litewskim w latach 1377–1382. Próba charakterystyki problemu / K. Osiński // Przegląd Prawniczy Ekonomiczny i Społeczny. – 2013. – № 1. – S. 80–88.*

*2. Wasilewski, T. Prawosławne imiona Jagiełły i Witolda / T. Wasilewski // Analekta Cracovensia. – 1987. – T. XIX. – S. 105–115.*

*3. Smolka, S. Unia Litwy z Koroną / S. Smolka. – Kraków : Spółka Wydawnicza Polska, 1903. – 144 s.*

*4. Prochaska, A. Król Władysław Jagiełło: T. 1–2 / A. Prochaska. – Kraków : Akademia Umiejętności, 1908. – T. 1. – 1908. – VII, 414 s.*

*5. Korchak, L. Litewska rada wielkoksiążęca w XV wieku / L. Korczak. – Kraków : Polska Akademia Umiejętności, 1998. – 120 s.*

*6. Zakrzewski, S. Wypadki lat 1382–1386 w związku z genezą Unji / S. Zakrzewski // Pamiętnik V Powszechnego Zjazdu Historyków Polskich w Warszawie, 28 listopada do 4 grudnia 1930 r., pod red. K. Tyszkowskiego. – Lwów : Nakładem Polskiego Towarzystwa Historycznego, 1930. – T. 1. – 1930. – S. 345–354.*